ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1983
6
КАСТРЫЧНІКА
ЧАЦВЕР
№ 25 (1401)

Выходзіць раз у тыдзень

Выдаецца з 1922 года.

## МЫ — ЗА МІР!

**ЗАЯВА Генеральнага сакратара ЦК КПСС, Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР Ю. У. Андропава знаходзіць гарачы водгук у савецкіх людзей. На сходах, якія прайшлі ва ўсіх падраздзяленнях універсітэта, студэнты, выкладчыкі і супрацоўнікі аднадушна заявілі аб поўнай падтрымцы міралюбівага знешнепалітычнага курса КПСС, аб цвёрдай рашучасці даць адпор агрэсіўным падкопам імперыялізму, аб імкненні сваёй самаадданай працай і выдатнай вучобай унесці ўклад ва ўмацаванне магутнасці Радзімы.**

**У прынятых рэзалюцыях гнеўна асуджаецца ваенна-палітычная істэрыя, якая раздуваецца адміністрацыяй ЗША, асабіста прэзідэнтам Рэйганам.**

**Выступаючыя падкрэслілі, што спакойны, ясны тон Заявы кіраўніка Савецкай дзяржавы дае ўпэўненасць у магчымасці прадухілення ядзернай катастрофы.**

"Беларускі універсітэт"
тэлетайп
• Учора • Сёння • Заўтра •

### *На сумесным пасяджэнні*

**партыйнага камітэта і Савета БДУ імя У. І. Леніна падведзены вынікі 1982—1983 навучальнага года і абмеркаваны задачы калектыву універсітэта па далейшаму павышэнню якасці і эфектыўнасці вучэбна-выхаваўчага працэсу ў святле рашэнняў XXVI з'езда КПСС. З дакладам «Аб выніках прыёму студэнтаў на першы курс у 1983 годзе і задачах універсітэта па арганізацыі прыёму ў 1984 годзе» выступіў адказны сакратар прыёмнай камісіі У. П. Гольцаў.**

**І. УЛАДЗІМІРАЎ,**
**наш кар.**

### *Нарада*

**на тэму «Сучасныя праблемы геахіміі ландшафтаў» адбылася на геаграфічным факультэце універсітэта. Сумесна з беларускімі вучонымі ў ёй прынялі ўдзел іх калегі з чатырнаццаці навуковых цэнтраў краіны. Актуальным праблемам геахімічных даследванняў ландшафтаў, іх меліярацыі і рацыянальнаму выкарыстанню ва ўмовах навукова-тэхнічнай рэвалюцыі было прысвечана больш за 10 пленарных дакладаў і каля 50 секцыйных і стэндавых паведамленняў.**

**І. ПІРОЖНІК,**
**намеснік дэкана геаграфічнага факультэта.**

### *Факультэт грамадскіх прафесій*

**запрашае студэнтаў на аддзяленні: арганізатараў культурна-масавай работы (секцыі кіраўнікоў агітбрыгад, дыктараў і вядучых, харэаграфіі, бальнага танца, эстэтыкі быту), грамадскіх кадраў газет і актывістаў насценнага друку (секцыі журналістыкі, фотакарэспандэнтаў, кінаапаратараў, мастакоў-афарміцеляў, стэнаграфіі), арганізатараў фізкультурна-масавай і спартыўнай работы (секцыі грамадскіх інструктараў па спорту, спартыўных суддзяў), арганізатараў работы з дзецьмі і падлеткамі і ваенна-патрыятычнай работы, школы маладога лектара і арганізатараў культурна-масавай работы.**

**Я. ПАМЫТКІН,**
**метадыст ФГП.**

### *Прыём дэлегатаў*

**І Міжнароднага кангрэса па біясферных запаведніках адбыўся ў БДУ імя У. І. Леніна. Вучоныя універсітэта выступілі з паведамленнямі, у якіх спыніліся на вялікім значэнні той работы, якая вядзецца ў БДУ па ахове акаляючага асяроддзя, адзначылі, што актыўны ўдзел у распрацоўцы дадзенай праблемы прымаюць студэнты.**

**Р. ЖМОЙДЗЯК,**
**дэкан геаграфічнага факультэта.**

—СЛОВА ДЭЛЕГАТА—

## *Мабілізуючая падзея*

**У адпаведнасці са Статутам КПСС у канцы 1983 — пачатку 1984 года ў пярвічных партарганізацыях, раённых, гарадскіх, акруговых, абласных і краявых арганізацыях партыі адбудуцца справаздачна-выбарныя сходы і канферэнцыі. Паспяховае правядзенне гэтай важнай палітычнай кампаніі заклікана забяспечыць далейшае ўмацаванне партыйных радоў, развіццё ўнутрыпартыйнай дэмакратыі, удасканаленне арганізатарскай і ідэалагічнай работы партыйных арганізацый, форм і метадаў партыйнага кіраўніцтва сацыяльна-эканамічнымі працэсамі, павышэнне кіруючай ролі КПСС у жыцці савецкага грамадства.**

**У канцы кастрычніка адбудзецца III партыйная справаздачна-выбарная канферэнцыя універсітэта. Прадстаўляем слова дэлегатам канферэнцыі.**

ВАЖНАЙ падзеяй у жыцці партыйнай арганізацыі Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна з'явіцца III універсітэцкая справаздачна-выбарная партыйная канферэнцыя. Камуністы механіка-матэматычнага факультэта разглядаюць перыяд падрыхтоўкі да яе як час усебаковага аналізу работы, мабілізацыі ўсяго калектыву на рашэнне задач, якія стаяць перад факультэтам, і галоўная з якіх — фарміраванне высокакваліфікаваных кадраў.

Прыемна адзначыць, што механіка-матэматычны факультэт падыходзіць да справаздачна-выбарнай канферэнцыі з нядрэнным багажом. Павялічылася колькасць студэнтаў, якія займаюцца на «добра» і «выдатна». Упершыню 17,4 працэнта студэнтаў здалі зімовую, а 14,8 працэнта — летнюю экзаменацыйныя сесіі толькі на «выдатна». Павысілася эфектыўнасць навукова-даследчай і навукова-метадычнай работы. Толькі ў 1982 годзе супрацоўнікамі факультэта надрукавана 6 манаграфій, 1 вучэбны дапаможнік з грыфам МінВНУ СССР, 4 вучэбна-метадычныя дапаможнікі з грыфам МінВНУ БССР, 154 навуковыя работы, з якіх 14 сумесна са студэнтамі. На базе факультэта ў мінулым годзе была арганізавана Усесаюзная школа па тэорыі аператараў, а ў гэтым — Усесаюзная алгебраічная канферэнцыя. Упершыню калектыў факультэта заняў трэцяе месца ва універсітэце па выніках сацыялістычнага спаборніцтва за 1982 год.

Ва ўсім гэтым ёсць вялікая заслуга камуністаў. Партыйнае бюро планавала работу і ажыццяўляла гэтыя планы ў цесным кантакце з дэканатам, кафедрамі, грамадскімі арганізацыямі.

У цэнтры ўвагі партыйнай арганізацыі заўсёды знаходзяцца пытанні паляпшэння вучэбнага працэсу, навуковай і метадычнай работы. На партыйных сходах і пасяджэннях партыйнага бюро абмяркоўваюцца вынікі зімовай і летняй экзаменацыйных сесій, вытворчай і педагагічнай практык студэнтаў, эфектыўнасць і якасць навукова-даследчай і навукова-метадычнай работы.

Пытанні ідэалагічнай, палітыка-масавай работы таксама заўсёды знаходзяцца ў полі зроку партыйнай арганізацыі механіка-матэматычнага факультэта. Вялікую работу ў гэтым напрамку праводзяць прафсаюзная і камсамольская арганізацыі факультэта, якія працуюць пад кіраўніцтвам партбюро і ў цесным кантакце з дэканатам. Факультэт з'яўляецца ініцыятарам правядзення камсамольскай атэстацыі, прапанаваў увесці грамадскіх кuратараў на першых курсах — гэтую ініцыятыву падтрымаў камітэт камсамола універсітэта. Факультэт быў ініцыятарам стварэння педагагічных камуністычных студэнцкіх атрадаў не толькі ва універсітэце, але і ў Беларусі. У нас існуе універсітэт этыкі і эстэтыкі, створаны клубы па інтарэсах: «Палітыка і моладзь», «Ты+я=сям'я», «Клуб цікавых сустрэч», «Клуб аматараў беларускай культуры». Факультэцкая мастацкая самадзейнасць трэці год запар займае першае месца ва універсітэцкім аглядзе мастацкай самадзейнасці. Прафсаюзная і камсамольская арганізацыі мехмата паспяхова спраўляюцца з пастаўленымі перад імі задачамі. Камсамольская арганізацыя штогод займае першае месца ва універсітэце па камсамольскай рабоце, студэнцкая прафсаюзная арганізацыя на працягу двух гадоў — другое месца па прафсаюзнай рабоце.

Вялікія змены адбыліся і ў структуры самой партыйнай арганізацыі пасля II універсітэцкай партыйнай канферэнцыі. За апошнія тры гады яна вырасла не толькі колькасна, але і якасна. Зараз на факультэце сярод камуністаў — 10 дактароў навук і прафесараў, 33 кандыдаты навук, створана партыйная група на кафедры лічбавых метадаў і праграміравання. Хочацца адзначыць, што сама падрыхтоўка да III універсітэцкай партыйнай канферэнцыі з'яўляецца для партыйнай арганізацыі механіка-матэматычнага факультэта добрай школай і акажа вялікую дапамогу ў арганізацыі партыйнай работы.

**А. КІЛБАС,**
**сакратар партбюро механіка-матэматычнага факультэта.**

# 7 кастрычніка — Дзень Канстытуцыі СССР



# Справа ўсіх і кожнага

**Пасля падрабязнага і дэталёвага абмеркавання матэрыялаў чэрвеньскага (1983 г.) Пленума ЦК КПСС ва ўсіх партгрупах і партыйных арганізацыях універсітэта, выпрацоўкі канкрэтных рэкамендацый па выкананню яго рашэнняў адбыўся сход партыйнага актыву Белдзяржуніверсітэта імя У. і. Леніна.**

**На ім прысутнічалі члены парткома, сакратары партыйных бюро і іх намеснікі па ідэалагічнай рабоце, вызваленыя работнікі прафсаюзных камітэтаў, камітэта камсамола, прарэктары, дырэктары НДІ, ІПК і СКТБ з доследнай вытворчасцю, дэканы факультэтаў, загадчыкі кафедр грамадскіх навук, кіраўнікі некаторых падраздзяленняў і грамадскіх фарміраванняў. У сходзе прынялі ўдзел намеснік загадчыка аддзела навукі і навучальных устаноў ЦК КПБ В. П. Кузьмянкоў, загадчык аддзела навукі і навучальных устаноў АК КПБ У. Д. Атрошчанка, інструктар Мінскага ГК КПБ І. Ф. Клімаў.**

**На сходзе выступілі: намеснік старшыні універсітэцкага савета прафілактыкі А. В. Дулаў, старшыня прафкома Э. В. Шастаковіч, старшыня праўлення таварыства «Веды» В. І. Гамаў, дырэктар СКТБ з доследнай вытворчасцю М. І. Акімаў, дэкан хімічнага факультэта В. Ф. Цікавы, загадчык кафедры ядзернай фізікі С. С. Шушкевіч, сакратар камітэта камсамола А. У. Казулін, рэктар універсітэта Л. І. Кісялеўскі.**

**З дакладам выступіў намеснік сакратара парткома БДУ імя У. І. Леніна П. І. Брыгадзін. Прапануем тэкст даклада ў скарачэнні.**

Сёння Камуністычная партыя і савецкі народ ажыццяўляюць буйнейшыя комплексныя сацыяльна-эканамічныя праграмы, дабіваюцца інтэнсіфікацыі вытворчасці, паскарэння навукова-тэхнічнага прагрэсу, рацыянальнага выкарыстання каласальных магчымасцей нашай эканомікі, навукі, культуры.

«У комплексе ўсіх гэтых пытанняў, якімі даводзіцца займацца партыйным камітэтам, кожнай партыйнай арганізацыі,— падкрэсліваў Ю. У. Андропаў,— ідэалагічная работа ўсё больш вылучаецца на першы план». І гэта не выпадкова. Ажыццяўленне намечаных планаў, рэалізацыя пастаўленых задач у многім вызначаецца ўзроўнем ідэйнай загартаванасці, працоўнай і сацыяльнай актыўнасці людзей, іх адносінамі да працы.

Галоўнымі задачамі ідэалагічнай работы ў сучасных умовах, як адзначалася на Пленуме, патрэбна лічыць творчае выкарыстанне багацейшага арсеналу сродкаў асветы і выхавання, выкарыстанне іх з улікам узроўню адукаванасці і патрэб савецкіх людзей, барацьба з фармалізмам, шаблонам у арганізацыі масава-палітычнай работы; правільны падбор, расстаноўка і павышэнне кваліфікацыі ідэалагічных кадраў і актыву; забеспячэнне значна больш высокага ўзроўню ідэйна-тэарэтычнай, работы ў галіне грамадскіх навук, актывізацыя работы нашых навуковых устаноў і кожнага вучонага паасобку, паварот іх да вырашэння рэальных, практычных задач; удасканаленне работы сістэмы палітычнай асветы, масава-палітычнай вучобы. Нарэшце, ва ўмовах вострага ідэалагічнага супрацьборства на сусветнай арэне выключна важна даходліва і пераканаўча раскрываць перавагі сацыялістычнага грамадства, дынамічна і эфектыўна выкрываць хлуслівую, падрыўную імперыялістычную прапаганду.

Існуючая сістэма выхаваўчай работы ў Белдзяржуніверсітэце ў цэлым адпавядае патрабаванням, якія прад'яўляе Камуністычная партыя да якасці падрыхтоўкі спецыялістаў высокай кваліфікацыі. Аднак гэта не азначае, што тут усе праблемы вырашаны. Ідэалагічная, масава-палітычная работа, якая праводзіцца ва універсітэце, заклікана забяспечыць высокую якасць падрыхтоўкі і выхавання савецкіх спецыялістаў, інтэнсіфікацыю навуковых даследванняў, фарміраванне здаровага маральнага мікраклімату, высокай працоўнай і сацыяльнай актыўнасці кожнага члена нашага калектыву. Вядома, што эфектыўнасць працэсу фарміравання ў будучых спецыялістаў высокай палітычнай і маральнай культуры, падрыхтаванасці і ўмення працаваць з поўнай аддачай сіл у многім вызначаецца пастаноўкай выкладання грамадскіх і спецыяльных дысцыплін.

Ва універсітэце на сённяшні дзень педагагічную дзейнасць вядуць 97 прафесараў, дактароў навук (7 працэнтаў ад колькасці ўсяго прафесарска-выкладчыцкага саставу), 691 дацэнт (50 працэнтаў). Гэты кваліфікаваны састаў дазваляе весці вучэбна-выхаваўчую работу на высокім ідэйна-тэарэтычным і метадычным узроўні.

Разам з тым, аналіз рэзультатаў летняй экзаменацыйнай сесіі выклікае і пэўныя заўвагі ў адрас дэканатаў, кафедр, грамадскіх арганізацый.

Павялічылася колькасць пропускаў заняткаў студэнтамі па няўважлівых прычынах. За вясенні семестр 1982—83 навучальнага года яны склалі 26 836 чалавека-гадзін. «Лідэрамі» ў гэтай справе з'яўляюцца геаграфічны і філалагічны факультэты. У святле патрабаванняў партыі за ўмацаванне дысцыпліны і парадку, за павышэнне арганізаванасці і адказнасці такое становішча недапушчальна. Паспяховасць па выніках летняй экзаменацыйнай сесіі па універсітэту склала 91,9 працэнта. Самая нізкая яна на філалагічным факультэце — 88,36 працэнта, самая



высокая — на геаграфічным — 97,54 працэнта.

Хвалюе нас і іншае — колькасць студэнтаў, якія атрымалі нездавальняючыя адзнакі — 693 чалавекі. Большасць з іх — філолагі (119 чалавек), потым ідуць механіка-матэматычны факультэт, факультэт радыёфізікі і электронікі, ФПМ. Такім чынам, найбольш сур'ёзнае становішча з вучэбнай дысцыплінай склалася на філалагічным факультэце. Партыйнай арганізацыі, дэканату неабходна зрабіць належныя вывады і прыняць адпаведныя меры.

Вельмі важнай і складанай задачай з'яўляецца стварэнне ў студэнцкіх групах моцнага і дружнага калектыву. Без ведання асаблівасцей характару студэнтаў, іх цэнасных арыентацый, патрабаванняў — вырашыць гэту задачу немагчыма. І тут партыйным і грамадскім арганізацыям, дэканатам неабходна рашуча выкараняць фармалізм, а часам і бяздзейнасць куратараў акадэмічных груп, студэнцкіх партгруп, камсамольскіх арганізацый акадэмічных груп.

Па рэзультатах сацыялагічных даследванняў толькі 9,7 працэнта студэнтаў адказалі, што галоўным матывам у актывізацыі вучэбнай дзейнасці з'яўляецца грамадская думка групы. З гэтага вынікае, што рэзерв для актывізацыі вучэбнай дзейнасці — гэта павышэнне ролі студэнцкага калектыву.

Другі напрамак паляпшэння вучэбна-выхаваўчага працэсу — ўдасканаленне методыкі выкладання, павышэнне кваліфікацыі выкладчыцкіх кадраў, узмацненне дыялектыка-матэрыялістычнай накіраванасці выкладання грамадскіх і ўсіх спецыяльных дысцыплін.

У маі-чэрвені 1983 года мы паспрабавалі вывучыць эфектыўнасць ідэалагічнай, масава-палітычнай работы, уздзеянне розных фактараў на фарміраванне цэнасных арыентацый, інтарэсаў моладзі. Вось ацэнка ведаў па грамадскіх навуках, дадзеная студэнтамі. Большасць з іх лічаць, што веды па грамадскіх навуках патрэбныя для вернай ацэнкі розных бакоў жыцця, цікавыя для пашырэння кругагляду, неабходны для правільнага выбару жыццёвага шляху. Гэтыя веды павінны, на думку студэнтаў, пераходзіць у асабістыя перакананні. Аднак 12 працэнтаў мяркуюць, што дастаткова мець толькі трывалыя веды.

Партгрупам, кіраўніцтву кафедр грамадскіх навук неабходна пастаянна павышаць эфектыўнасць выхаваўчага ўздзеяння сацыяльна-эканамічных дысцыплін. Асабліва трэба адзначыць ролю выпускаючых кафедр грамадскіх навук — гісторыі КПСС, марксісцка-ленінскай філасофіі, палітэканоміі.

У дакументах Пленума ЦК КПСС пастаўлена задача удасканалення планавання і арганізацыі навуковых даследванняў, стылю і метадаў работы навуковых падраздзяленняў. Ва універсітэце ў 1982 годзе выконваліся 452 тэмы навукова-даследчых работ, у тым ліку па дзяржбюджэтнай тэматыцы — 262, па гаспадарча-дагаворнай — 190. З агульнай колькасці НДР 131 тэма (29 працэнтаў) выконвалася па Дзяржаўнаму плану эканамічнага і сацыяльнага развіцця, мэтавых комплексных навукова-тэхнічных праграмах, пастановах урада, Дзяржкамітэта СССР па навуцы і тэхніцы (для параўнання, у 1981 г. — 124 тэмы — 27,8 працэнта). Усяго ва універсітэце па важнейшай тэматыцы выконвалася 351 тэма (77,7 працэнта). Усё гэта сведчыць, што працэс узбуйнення тэматыкі, канцэнтрацыі сіл і сродкаў на выкананне фундаментальных і прыкладных даследванняў працягваецца.

Пашыраюцца і мацнеюць сувязі універсітэта з вытворчасцю. Заключаны з прадпрыемствамі 304 дагаворы аб навукова-тэхнічным супрацоўніцтве.

Эканамічны эфект ад укаранення НДР на адзін рубель затрат склаў у 1982 годзе 2 рублі 03 капейкі. Разам з тым, аналіз навуковай дзейнасці нашых падраздзяленняў паказвае, што ва універсітэце дапушчана некаторае паніжэнне рэнтабельнасці гаспадарча-дагаворных работ.

У гэтай сувязі партыйным арганізацыям навуковых падраздзяленняў, кафедр патрэбна сканцэнтраваць намаганні на пошуку рэзерваў павышэння вытворчасці працы, кваліфікацыі навуковых супрацоўнікаў, паляпшэння дысцыпліны.

Чэрвеньскі (1983 г.) Пленум ЦК КПСС, разглядаючы задачы ўдасканалення ідэалагічнай работы, асаблівую увагу звяртае на неабходнасць павышэння ўзроўню ідэалагічнай работы перш за ўсё ўнутры партыі. Ва універсітэце склалася пэўная сістэма ў рабоце з рэзервам для папаўнення партыйных радоў, з маладымі камуністамі, сістэма палітычнай вучобы членаў КПСС.

На факультэтах і ў падраздзяленнях працуюць школы маладога камуніста, арганізавана 43 метадалагічныя, 32 тэарэтычныя семінары, 12 школ навуковага камунізму, 7 палітшкол і 5 школ асноў марксізму-ленінізму. Штогод каля 120 чалавек мы накіроўваем на вучобу на факультэт навукова-педагагічных кадраў універсітэта марксізму-ленінізму пры Мінскім АК КПБ. Аднак адносіны некаторых камуністаў да розных форм партыйнай вучобы нярэдка выклікаюць здзіўленне. Несвоечасовая здача экзаменацыйнай сесіі, пропускі заняткаў разглядаюцца партыйнымі арганізацыямі як дапушчальная з'ява. Вынік—у гэтым годзе на першыя заняткі універсітэта марксізму-ленінізму з'явілася 50 працэнтаў слухачоў. Думаецца, што партбюро падраздзяленняў, бюро парткома дадуць прынцыповую ацэнку гэтаму факту.

Дзейсным сродкам фарміравання марксісцка-ленінскага светапогляду з'яўляюцца разнастайныя формы масава-палітычнай работы. Ва універсітэце склалася пэўная практыка правядзення адзіных палітдзён, палітычных інфармацый. Павысілася якасць нагляднай агітацыі, насценнага друку. Узбагаціўся змест Ленінскага заліку, ГПП, павялічана колькасць слухачоў факультэта грамадскіх прафесій.

Разам з тым, вынікі ідэалагічнага ўздзеяння нашых партыйных, грамадскіх арганізацый і фарміраванняў, кіраўнікоў падраздзяленняў на працоўныя калектывы, студэнцкую моладзь не ў поўнай меры нас задавальняюць.

Прафсаюзным, камсамольскім арганізацыям неабходна актывізаваць дзейнасць па развіццю самадзейнай мастацкай творчасці, фізкультурнай і спартыўна-масавай работы, арганізацыі вольнага часу моладзі.

Камітэту камсамола, Савету па ГПП патрэбна павысіць эфектыўнасць Ленінскага заліку і грамадска-палітычнай практыкі студэнтаў. Асаблівы клопат выклікае якасць заняткаў на ФГП. І тут мы выказваем слушныя заўвагі кафедры грамадскіх навук, якая забяспечвае навучальны працэс факультэта, аднак самаўхілілася ад кантролю за вучобай сваіх слухачоў, камітэту камсамола — арганізатару вучобы.

Праводзячы ідэалагічную, масава-палітычную работу ў сваіх калектывах, партыйныя арганізацыі факультэтаў і падраздзяленняў павінны ўлічваць спецыфіку нашай ВНУ. І перш за ўсё—наяўнасць значнага кантынгенту замежных студэнтаў, аспірантаў і стажораў (каля 900 чалавек). Сёння можна канстатаваць, што за апошні час праблена значная работа па ўдасканаленню вучэбна-выхаваўчага працэсу, павышэнню якасці падрыхтоўкі спецыялістаў. Скарацілася колькасць пропускаў заняткаў без уважлівых прычын, павысілася паспяховасць замежных навучэнцаў. Распрацаваны і чытаюцца спецкурсы па праблемах ідэалагічнай барацьбы (кафедра навуковага камунізму), крытыцы сучаснай буржуазнай філасофіі, крытыцы сучасных буржуазных канцэпцый асобы (кафедра марксісцка-ленінскай філасофіі гуманітарных факультэтаў) і інш.

Разнастайнасць форм ідэалагічнай, масава-палітычнай работы не гарантуе поспеху ў рэалізацыі патрабаванняў чэрвеньскага (1983 г.) Пленума ЦК КПСС. Задача, на наш погляд, заключаецца ў распрацоўцы дакладнай структуры кіраўніцтва, зладжанасці ўсіх звенняў сістэмы ідэалагічнай работы, якасці і яшчэ раз якасці нашай работы.

У БДУ імя У. І. Леніна распрацаваны комплексны план камуністычнага выхавання моладзі на ўвесь перыяд навучання, комплексны план выхаваўчай работы з замежнымі навучэнцамі на 5 гадоў і інш. Аднак гэтыя дакументы не сталі асноўнымі ў рабоце аддзелаў парткома, адміністрацыі, партыйных і грамадскіх арганізацый і фарміраванняў, куратараў.

Парткому, рэктарату, партыйным арганізацыям неабходна ўзмацніць кантроль за рэалізацыяй намечаных планаў, пастаноў. Патрэбна звярнуць асаблівую ўвагу на якасць ідэалагічных, масава-палітычных мерапрыемстваў, давядзення пачатых спраў да завяршэння, на ацэнку і прагназіраванне стану ідэалагічных працэсаў.

Рашэнне складаных і шматгранных задач ідэалагічнай работы немагчыма без сістэматычнай і мэтанакіраванай дзейнасці партыйных арганізацый, адміністрацыі падраздзяленняў, грамадскіх арганізацый і фарміраванняў, без павышэння персанальнай адказнасці кіраўнікоў усіх рангаў, кожнага камуніста за стан ідэалагічнай, выхаваўчай работы ў калектывах, светапоглядныя пазіцыі кожнага выкладчыка, супрацоўніка і студэнта універсітэта.

ЭКЗАМЕН ПРЫНЯЛА ВОСЕНЬ

# ПРАЦОЎНЫ МЕСЯЦ ВЕРАСЕНЬ

ВОСЕНЬ ДЛЯ сельскага працаўніка — гэта, бадай, самы цяжкі і напружаны час. Яна заўсёды прыносіць шмат неадкладных спраў: адначасова патрэбна сеяць азімыя, завяршаць нарыхтоўку кармоў для жывёлы, прыводзіць да ладу сена і лён. Але самая адказная работа ў гэты перыяд — уборка бульбы.

Так павялося, што ў верасні на дапамогу працаўнікам калгасаў і саўгасаў прыязджаюць навучэнцы прафесійна-тэхнічных вучылішчаў, тэхнікумаў, ВНУ. Вядома, для кіраўнікоў гаспадарак гэтыя дні прыносяць дадатковыя клопаты: патрэбна усіх уладкаваць, арганізаваць харчаванне, своечасова забяспечыць работай. І ад таго, наколькі аператыўна і правільна будуць вырашаны гэтыя і іншыя пытанні, залежаць тэмпы ўборкі «другога хлеба».

Не стаяць у баку ад гэтай справы і студэнты Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна. Звыш 60 сельскагаспадарчых атрадаў праводзілі свой працоўны семестр на палетках Круглянскага, Шклоўскага, Чавускага, Быхаўскага і Клімавіцкага раёнаў Магілёўскай вобласці.

Студэнты І—IV курсаў гістарычнага факультэта працавалі ў калгасах «Рассвет», «Шлях Леніна», «Кастрычнік» і саўгасе «Круча» Круглянскага раёна. Выехалі студэнты на сельгасработы 3 верасня. Але кіраўніцтва раёна лічыць, што прыехалі яны крышку ранавата. Справа ў тым, што раён у асноўным льнаводчы. А надвор'е не дазваляла займацца ўборкай гэтай культуры. Пасля таго, як лён паслалі, ён павінен намокнуць і толькі тады яго можна вязаць у снапы. Але дажджу, як знарок, не было. І тут узнікла пытанне: што рабіць такой колькасці студэнтаў. Але справа знайшлася. Памочнікі заняліся ўборкай буракоў. За чатырнаццаць дзён толькі ў калгасе «Рассвет» гэтай культуры было ўбрана звыш 180 тон.

Наогул, патрэбна сказаць, што кіраўніцтва гаспадаркі сур'ёзна паклапацілася аб прыёме сельскагаспадарчых атрадаў: загадзя знайшлі кватэры для рассялення, вырашылі пытанні, звязаныя з харчаваннем, поўнасцю забяспечылі работай, тэхнікай.

Разам з беларускімі студэнтамі на сельгасработы выехалі і студэнты з Арменіі, Грузіі, Узбекістана, Таджыкістана, Сярэдняй Азіі і іншых рэспублік. Кіраўніцтва калгаса «Рассвет» высветліла іх патрэбы, студэнтаў забяспечылі цёплай вопраткай і ўсім неабходным. Стараннай працай аддзякавалі памочнікі за сардэчны прыём і ўважлівыя, шчырыя адносіны. Ударна працавалі, паказваючы прыклад сябрам, Леанід Скоарца і Эдуард Цімчук (Малдавія), Нурыла Ібрагімава і Алена Лысаконь (Казахстан), Іна Квяцінска (Латвія), Джусумбек Амураліеў (Кіргізія) і многія іншыя.

— Мы задаволены адносінамі кіраўніцтва калгаса «Рассвет» да нашых студэнтаў,— расказвае камандзір атрада выкладчык кафедры гісторыі КПСС гуманітарных факультэтаў Юрый Вітальевіч Чурмакоў.— Нам падабаліся смачна прыгатаваныя мясцовымі паварамі абеды ў сталоўцы. Раз у тыдзень мы мелі магчымасць памыцца ў лазні. За атрадам была замацавана машына. Словам, для нас стварылі ўсе ўмовы, таму і работа была наладжана, і настрой быў бадзёрым.

І рабяты стараліся. Не толькі ў полі. Чыталі лекцыі, дапамагалі мясцовай школе рамантаваць памяшканне, знаёмілі школьнікаў з Белдзяржуніверсітэтам і родным факультэтам, добраўпарадкавалі помнік загінуўшым у гады Вялікай Айчыннай вайны, спаборнічалі з калгаснай моладдзю на спартыўных пляцоўках...

У калгасе «Шлях Леніна» у гэтым годзе працавалі студэнты II і IV курсаў аддзялення філасофіі і І—IV курсаў аддзялення палітэканоміі. Гаспадарка — адна з лепшых у раёне. Студэнты заўсёды былі забяспечаны работай. Іх разбілі на тры групы па дзесяць чалавек і назначылі старшага з ліку студэнтаў, а за кожным падраздзяленнем замацавалі прадстаўніка калгаса, які вырашаў усе ўзнікаючыя пытанні. Калі ж на дадзеным участку адной з груп работы не было, яе хутка перавозілі ў іншае месца. Усе гэтыя мерапрыемствы, безумоўна, эканомілі час, павышалі прадукцыйнасць працы, аблягчалі кантроль за работай студэнтаў.

Самі ж рабяты ўсвядомілі ўсю адказнасць той справы, якую яны робяць. Нікому не патрэбна даводзіць, што сёлетні год не зусім спрыяльны для працаўнікоў вёскі. Дажджы не часта радавалі нас. Гэта значна адбілася на ўраджайнасці «другога хлеба», што яшчэ больш востра паставіла задачу перад удзельнікамі уборкі, у тым ліку і перад студэнтамі: своечасова, без страт убраць вырашчанае, не пакінуць у зямлі ніводнага клубня. Яны разумелі, што сёння кантроль за якасцю ўборкі кладзецца на кожнага з іх.

Упэўнена, што сваёй добрасумленнай, стараннай працай, актыўным удзелам у грамадскім жыцці студэнты пакінулі аб сабе ў мясцовых жыхароў добрыя ўспаміны.

**З. АЛЯШКЕВІЧ,**
**наш кар.**

# ПЕРШАЕ ВЫПРАБАВАННЕ «ХІМІКА»

● **ФОТАРЭПАРТАЖ**





БАЙЦЫ сельскагаспадарчага атрада «Хімік» працавалі на бульбяных палетках Клімавіцкага раёна. Атрад быў сфарміраваны на базе першага курса педагагічнага патока хімфака. За час работы байцамі ўбрана 1670 тон бульбы, 290 тон буракоў, перапрацавана 1880 тон збожжа. Стараннай працай вызначаліся Сяргей Лобаў, Таццяна Шэйка, Лілія Хурса, Людміла Мазалеўская, Ала Кіпель і іншыя.

«Хімік» працаваў добра. Так лічаць і кіраўнікі гаспадаркі, з якімі давялося пагутарыць. Аднак байцы атрада не абмяжоўваліся толькі работай. Яны выступалі з канцэртамі перад жыхарамі сваёй і суседніх вёсак, прачыталі некалькі лекцый, аказалі дапамогу інваліду Вялікай Айчыннай вайны Я. П. Галалобаву.

**НА ЗДЫМКАХ: поўным ходам ідзе ўборка бульбы ў саўгасе «Высакоўскі» Клімавіцкага раёна; Наташа Чэркас і Ала Кіпель на бульбаўборачным камбайне; Ліля Хурса—баец сельгасатрада «Хімік»; у час перапынку. Наташа Афанасьева.**

**С. ПЛЫТКЕВІЧ,**
**наш кар.**
Фота **аўтара.**





## Сяргей ЧЫГРЫН

### ТРЫПЦІХ ЛІСТАПАДА

I

Асенні дождж, увішны і
халодны,
Старанна лье на голыя палі,
Іграе вецер у палоне клёнаў,
Нясе ў прыполе лісце па зямлі.
Даўжэюць ночы цёмныя
і золкія,
Эскадры хмар плывуць над
сумным гаем.
Толькі радасць светлая
і звонкая
Фарбай восені паволі дагарае—
Наравітай зімы чакае.

II

Бераг восені — лістапад,
Россып апаўшых лістоў
Апрануў анямелы сад,
Хаты ціхія, рукі кустоў...
Існуе мова восеньскіх дрэў—
Красаванне і трапятанне.
Аднойчы я зразумеў:
Лісце песні пяеападаннем...
Ахутаў усё лістапад,
На канцэрт я іду — у сад.

III

Водблескі ранішняй зары
Ільсняцца на хвалях сярдзітых,
Лістапада лісток дагарыць,
Ападзе на далоні блакіту.
Наўмысна вятры наляцяць,
Будуць плакаць яны, як
дзіця...
Ліст пажоўклы не акрыяць —
Адляцеў ён ад дрэва жыцця.

## Павел ХМАРА

### ЭКЗАМЕНЫ

**Студенту, не имеющему «хвостов», посвящается**

Летим ли, спим или идем
с охоты,
работаем, стоим ли у ворот —
нас каждый миг экзаменует
кто-то,
оценку нашим действиям дает.
Порой оценка—подзатыльник
мамин,
порой—клеймо презрения
к вралю...
А страшный суд—
вступительный экзамен
на право проживания в раю.
Тому, кто выдержал экзамен,
—браво!
Тому, кто снова срезался, —
не ныть!
Всю жизнь сдаем экзамены
на право
казаться, называться, слыть
и быть,
на право быть избранником
удачи,
стать гением, Сазоновым,
врачом,
добиться славы, быть рабом
у дачи,
разжиться по дешевке
кирпичом,
на право выйти в громкие
поэты,
в созвездия экрана, вратари...
Давай, судьба, раскладывай
билеты
и, где счастливый, мне
не говори!
Но если мы даем ответы
четко,—
поставь пятерку, будь душой
щедра!
И пусть рука не дрогнет
над зачеткой,
в какой «по делу» надо
ставить «два».
Экзамены! Вот в том-то весь
и фокус—
их нужно сдать, хоть радуйся,
хоть плачь,
поскольку наша жизнь —
извечный конкурс
на соисканье степеней удач.
И мы сдаем, срезаемся,
дерзаем,
и каждый день вступаем
в новый бой...
Скажи, читатель, сдал ли я
экзамен
на право быть прочитанным
тобой?

**УСПОМНІ, ТАВАРЫШ!**

# БЕЛДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭТ ПАД МАСКВОЙ

**40 гадоў назад, у такія ж кастрычніцкія дні на станцыі Сходня пад Масквой пачаліся рэгулярныя заняткі ў Белдзяржуніверсітэце...**

Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны на шасці факультэтах універсітэта вучылася больш за дзве тысячы студэнтаў, прафесарска - выкладчыцкі калектыў налічваў звыш 150 чалавек. За першае дваццацігоддзе універсітэт падрыхтаваў 5240 высокакваліфікаваных спецыялістаў. Фашысцкія захопнікі напалі на нашу краіну, калі універсітэт рыхтаваўся ўрачыста адзначыць сваё 20-годдзе. Большасць яго вучоных, супрацоўнікаў і студэнтаў у першыя дні вайны пайшлі ў рады Савецкай Арміі, партызанскія атрады, народнае апалчэнне, знішчальныя батальёны. Выхаванцы універсітэта праявілі высокую мужнасць і адвагу ў баях, многія з іх аддалі сваё жыццё за свабоду і незалежнасць нашай Радзімы.

Раптоўнасць нападзення, вераломнасць фашыстаў і хуткае наступленне ворага ў пачатку вайны не дазволілі эвакуіраваць універсітэт на усход краіны. Акупіраваўшы Беларусь, фашысты нанеслі велізарныя матэрыяльныя страты яе гаспадарцы і культуры. Былі разбураны таксама ўсе вучэбныя карпусы і інтэрнаты універсітэта. Маёмасць музеяў, лабараторый, кабінетаў, аранжарэя, бібліятэка, архіў былі ці знішчаны, ці вывезены ў фашысцкую Германію. Страты, нанесеныя універсітэту гітлераўцамі, складаюць 36,5 мільёнаў рублёў.

У цяжкія гады вайны Камуністычная партыя і Савецкі ўрад праявілі выключны клопат аб Беларускім універсітэце. 15 мая 1943 года Савет Народных Камісараў прыняў пастанову аб аднаўленні работы універсітэта. У хуткім часе пад Масквой пачаліся рэгулярныя заняткі на філалагічным, гістарычным, біялагічным, геаграфічным, фізіка-матэматычным і хімічным факультэтах. Да пачатку 1944 года ва універсітэце вучылася 289 студэнтаў. Вялікую дапамогу ў адраджэнні універсітэта і наладжванні яго работы аказалі партыйныя і савецкія органы Масквы і вобласці, маскоўскія педагагічныя інстытуты і універсітэт імя М. В. Ламаносава.

**НАШЫ ГОСЦІ**

# «Мы яшчэ да вас прыедзем!..»



ВОСЬ УЖО шмат гадоў на базе нашага універсітэта праводзяцца кароткатэрміновыя курсы рускай мовы для замежных слухачоў, якія прыязджаюць у Мінск па лініі Бюро міжнароднага маладзёжнага турызму «Спадарожнік».

Раней мы прымалі слухачоў з Італіі. У гэтым годзе на курсы прыяджалі групы слухачоў з Фінляндыі і ФРГ.

На працягу трох тыдняў у аўдыторыях і кабінетах філалагічнага факультэта вопытныя выкладчыкі кафедр рускай мовы як замежнай універсітэта, педагагічнага і політэхнічнага інстытутаў праводзілі заняткі.

У анкеце, якая была прапанавана слухачам у канцы курсаў, усе без выключэння адзначылі іх высокую арганізацыю, добрыя ўмовы, створаныя для заняткаў, а таксама высокі ўзровень работы выкладчыкаў.

«Калі мы прыехалі ў Мінск тры месяцы назад, я нічога не ведала пра сталіцу Беларусі і амаль не размаўляла па-руску — саромелася. Зараз я магу размаўляць з мінчанамі на вуліцы і з задавальненнем слухаю іх расказы пра горад, пра іх жыццё. Мне тут вельмі падабаецца, усё цікава»,— напісала ў сачыненні слухачка з Фінляндыі Раіла Коскінен.

Вялікую дапамогу ў арганізацыі і рабоце курсаў аказаў ідэалагічны атрад камітэта камсамола універсітэта.

Кіраўнік групы з ФРГ Херман Балдэс у час развітальнага вечара заявіў, што такія курсы не толькі прыносяць вялікую карысць тым, хто дома займаецца вывучэннем рускай мовы, але і спрыяюць лепшаму ўзаемаразуменню паміж маладымі людзьмі нашых краін, што ў сваю чаргу павінна садзейнічаць захаванню міру на зямлі.

**У. БУДАЙ,**
**кіраўнік інтэрпрэс-цэнтра.**

**НА ЗДЫМКАХ: слухачы з ФРГ у музеі універсітэта; на ўроку рускай мовы слухачы з Фінляндыі.**

**Фота аўтара.**







# ЛІХТАРЫК вітае, раіць і... папярэджвае

**Дзень добры, сябры! Ліхтарык рады вітаць вас у новым навучальным годзе. Найлепшых вам поспехаў у працы, вучобе і адпачынку!**

**Ліхтарыку хацелася б, каб вы траплялі пад яго яркі прамень толькі за добрыя ўчынкі. А тым, хто любіць іншы раз праспаць першую пару заняткаў, хто не супраць схадзіць у кіно з апошняй лекцыі, хто разводзіць бруд і неахайнасць у інтэрнаце, хто псуе бібліятэчныя кнігі, хто малюе на аўдыторных сталах, Ліхтарык раіць задумацца над сваімі паводзінамі. Ліхтарык строга папярэджвае сваіх «старых знаёмых»: двоечнікаў, прагульшчыкаў і лайдакоў—паблажкі не будзе!**

**З НАШАЙ ПОШТЫ**

# ДЭКАДА КНІГ ГДР

ВАЖНАЙ ПАДЗЕЯЙ культурнага жыцця сталіцы з'явілася традыцыйная дэкада кніг Германскай Дэмакратычнай рэспублікі, якая адкрылася ў кніжным магазіне «Дружба» напярэдадні нацыянальнага свята нямецкага народа — Дня ўтварэння ГДР. Тут прадстаўлена больш як 1200 назваў кніг, якія выйшлі ў буйнейшых выдавецтвах ГДР. Спецыяльна да дэкады магазін атрымаў больш як 100 навінак кнігавыдаўцоў гэтай краіны.

Аматары мастацкай літаратуры змогуць набыць на выстаўцы-продажы творы нямецкіх класікаў. Сучасная літаратура ГДР прадстаўлена творамі А. Зэгерс, В. Брэдэля, Г. Канта, Э. Нойча, І. Бехера і іншых.

У продажы — кнігі рускіх і савецкіх пісьменнікаў Ф. Дастаеўскага, І. Буніна, А. Ахматавай, К. Федзіна, П. Праскурына, выдадзеныя на нямецкай мове.

У дні дэкады магазін парадуе сваіх пакупнікоў вялікім асартыментам дзіцячай літаратуры, кніг па кулінарыі і дамаводству. Прыцягнуць увагу наведвальнікаў цудоўна выдадзеныя альбомы па мастацтву.

Пакупнікі змогуць таксама аформіць папярэдні заказ на кнігі выдавецтваў ГДР.

**С. ЖУК,**
**начальнік аддзела прапаганды і рэкламы Мінаблкнігагандлю.**


БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

6 кастрычніка 1983 г.

Зак. 1680 АТ 04476

220080, МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3.

ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар

В. П. ВАРАБ'ЕЎ